жи в духе советского патриотизма, постоянной готовности к защите своей Родины». Под его руководством в калининградском экскурсионном бюро был разработан маршрут «По местам боев за Кёнигсберг». Он стремился в экскурсии сочетать личные воспоминания участников боев за Кёнигсберг с имевшимися описаниями Восточно-Прусской операции, демонстрировал карты и схемы боев, фотографии, о Героях Советского Союза рассказывал непосредственно на местах, где они совершили подвиги. Перед экскурсией Сковородский обязательно выяснял, есть ли среди экскурсантов участники взятия Кёнигсберга и во время экскурсии представлял им слово. В справке особо отмечалось, что «воспоминания участников событий, о которых рассказывается в экскурсии, придают экскурсии неповторимо эмоциональную окраску, глубокую убедительность»[1, д. 217, л. 94-97].

Закреплению памяти о Великой Отечественной войне, подвиге советских людей и победе над фашизмом способствовали и многочисленные экскурсии за пределы области. В частности, многие калининградцы совершали экскурсионные поездки по городам-героям, местам боев 3-го Белорусского фронта в Литве, в Брестскую крепость, на родину Героя Советского Союза литовской партизанки М. Мельникайте в Зарасай[1, д. 155, л. 1; д. 162, л. 4; д. 165, л. 29; д. 220. л. 157].

Таким образом, в деятельности калининградских экскурсоводов в 1970-е – 1980-е годы ключевой темой являлось информирование слушателей о подвиге советских войск, разгромивших группировку фашистов в Восточной Пруссии в ходе Великой Отечественной войны. Эта проблема доминировала в тематике экскурсий, она была основой для патриотического воспитания жителей региона и его гостей, ее можно рассматривать как краеугольный камень в формировании их исторической памяти. Множество памятных мест, связанных с победой в войне, позволяли экскурсоводам использовать разнообразные методы воздействия на историческое сознание экскурсантов. Руководители экскурсионных организаций, а в широком смысле и местные власти понимали важность данной стороны экскурсионной работы, поддерживали и пропагандировали методические достижения экскурсоводов, проводивших экскурсии по военно-патриотической тематике.

***Статья подготовлена при финансовой поддержке РГНФ в рамках научного проекта № 15-21-06002а(м) «Политика памяти в российско-польско-литовском пространстве на территории бывшей Восточной Пруссии: Преемственность и изменения культурного ландшафта (1945—2015 гг.)».***

1. Государственный архив Калининградской области. Ф. Р-153(Калининградский областной совет по туризму и экскурсиям). Оп. 1.
2. Калининград: Справочник-путеводитель. Калининград, 1983. – 274 с.

## БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІЯ ГУМАНІТАРНЫЯ АДНОСІНЫ ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ КУЛЬТУРНАГА ПАМЕЖЖА

С.У. Снапкоўскі (Мінск, Беларусь)

Культурнае беларуска-польскае супрацоўніцтва набывала даволі разнастайныя формы ў перыяд з 1980-х - 1990-х гг. Двухбаковыя кантакты інтэнсіўна развіваліся ў галіне літаратуры, мастацтва, кнігадруку, узаемадзеяння паміж бібліятэкамі, аховы гістарычнай спадчыны і інш. У красавіку 1990 г. у Мінску адбыўся першы міжнародны фестываль нацыянальных драматычных тэатраў “Славянскія тэатральныя сустрэчы”, удзел у якім прынялі нацыянальныя драматычныя тэатры Беларусі, Польшчы, Балгарыі, Славаччыны, Украіны і Расіі. У сакавіку 1992 г. польскія тэатры прынялі ўдзел у Міжнародным фестывале “Балтыйская тэатральная вясна” у Гродне. Сумесныя пректы рэалізоўваліся Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Беларусі і Філармоніяй Лодзі, Дзяржаўным камерным аркестрам РБ і Камерным аркестрам РП “Камерата Віступа”, Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатрам оперы і балету Мінска і Дзяржаўнай операй Лодзі [1, с. 5-6].

На тэрыторыі Беларусі даволі актыўным і разнастайным стала жыццё польскай меншасці на тэрыторыі  Беларусі ў пачатку 1990-х гг. У 1990 г. польскі Сенат, верхняя палата пардамента Польшчы, выступаючы ў традыцыйная для сябе ролі апякуна польскай дыяспары за мяжой, вызначыў прыярытэтная накірункі супрацоўніцтва з польскай дыяспарай у Беларусі: развіццё агульнаадукацыйных праектаў, падтрымка польскай культуры і спорту, фінансавая падтрымка дзейнасці польскіх арганізацый, падтрымка польскага прадпрымальніцтва за мяжой і яго супрацоўніцтва з Польшчай [3, с 59.].

Статыстыка сцвярджае, што за 2001 г. польская меншасць у Беларусі налічвала 396 тыс. (3,9% у складзе усяго насельніцтва) грамадзян, з’яўляючыся другой буйнейшая меншасцю пасля рускіх. Польскі даследчык Ежы Рыхлік звяртае ўвагу на тое, што толькі невялікая частка грамадзян Беларусі польскай нацыянальнасці (13,3%) разглядала польскую мову ў якасці роднай (у Літве гэты паказчык складаў 84,8%, ва Украіне – 12,5%). Большая частка польскай меншасці (294 тыс.) пражывае ў Гродзенскай вобласці, складаючы 24,8% жыхароў. Па меркаванні Е.Рыхліка, у асяроддзі інтэлігенцыі польскай нацыянальнасці ў Беларусі назіралася трывалая слабасць поўнасцю свядомай і крэатыўнай самаідэнтыфікацыі з польскай нацыянальнасцю. Даследчык падкрэсліваў, што, нягледзячы на наяўнасць істотнай колькасці высокаадука-



Репозиторий ВГУ

ваных асоб, маючых навуковыя ступені, сярод прадстаўнікоў польскай меншасці на Гродзеншчыне, толькі нязначная іх частка прымае ўдзел у жыцці польскай меншасці [1, с. 24].

У другой палове 1980-х гг. у БССР значна ўзрасла ўвага да патрэб польскай меншасці ў рэспубліцы. Адпаведна быў прыняты шэраг захадаў па іх задаваленні. У 1987-1988 гг. навучальным годзе 11 вучняў Ласоснаўскай сярэдняй школы Гродзенскага раена пачалі факультатыўна вывучаць польскую мову. Да 1988 г. у Беларусі не існавала школ, дзе б у межах праграмы вывучалася польская мова. Аднак з пачаткам перабудовы сітуацыя змянілася: у 1990-1991 гг. польская мова ў якасці прадмета вывучалася ў 12 класах. У верасні 1991 г. у Гродна былі адкрыты 2 класы з польскай мовай навучання, а яшчэ ў 15 класах (у тым ліку ў 3 першых) польская мова пачала выкладацца ў якасці прадмета.

Згодна з Польскім культурна-асветніцкага таварыствам імя Т. Міцкевіча, у 1988/1989 навучальным годзе польскую мову вывучалі толькі 980 школьнікаў, то ў 1989/1990 годзе іх колькасць павялічылася больш чым у 6,5 разоў і склала 6 500 навучэнцаў. У 1989 г. Гродзенскае радыё распачало штотыднёвыя трансляцыі перадачы на польскай мове. Пры гэтым супрацоўнікі радыё абапіраліся на падтрымку Беластоцкага радыё і тэлебачання, якія выпускалі аналагічную праграму для беларусаў Польшчы. У 1990 г. пачала выходзіць двойчы на месяц тэлевізійная праграма “Голас над Нёманам”, створаная для польскай меншасці на Гарадзеншчыне. Адначасова перадачу маглі глядзець і жыхары Беластоцкага ваяводства [2, с. 91].

Напрыканцы 1980-х гг. і ў пачатку 1990-х гг. назіралася ажыўленне жыцця польскай меншасці ў Беларусі. У пачатку 1990-х гг. польская мова выкладалася ў асобных класах 42 школ Брэсцкай вобласці. У гімназіі польскую мову вывучаў 131 навучэнец, у ліцэі – 100 вучняў, у абласным цэнтры моладзевай творчасці – 105 чалавек, у гарадскім Доме дзіцячай і юнацкай творчасці – 15 навучэнцаў. Усяго на Берасцейшчыне польская мова вывучалася ў якасці абавязковай 900 вучнямі і ў якасці факультатыва альбо як другая замежная мова 1 166 навучэнцамі [12, с. 10]. У 1990 г. на базе польскіх культурна-асветніцкіх таварыстваў быў утвораны Саюз палякаў у Беларусі (СПБ; Związek polaków na Białorusi).

Першай зарэгістраванай у БССР арганізацыяй, шчыльна звязанай з культурай Польшчы і польскай меншасцю ў Беларусі, стаў Клуб аматараў польскай культуры ў Лідзе, зарэгістраваны 13 снежня 1987 г. У 1988-1990 гг. паўсталі Польскі клуб “Рота” у Баранавічах, Польскае таварыства Р.Траўгута ў Брэсце, Культурна-асветніцкае таварыства А.Міцкевіча ў Гродне, Культурна-асветніцкае таварыства “Палонія” у Мінску. Гэтыя арганізацыі, аб’яднаўшыся, утварылі СПБ [1, с. 98].

Ключавой задачай арганізацыі стала нацыянальнае адраджэнне палякаў у Беларусі праз папулярызацыю польскай мовы сярод польскага насельніцтва і аказанне падтрымкі ў яе вывучэнні. Най больш актыўнымі ўдзельнікамі пачатковага этапу дзейнасці СПБ былі ваенны, падпалкоўнік памежных войскаў Тадэвш Гавін, педагог, дырэктар школы ў Сонічах Юзэф Лучнік, доктар філалогіі Інстытута біяхіміі ў Гродне Станіслаў Сянкевіч, інжынер Тадэвуш Малевіч, доктар біяхіміі Анатоль Пацэнка, інжынер Францішак Вітовіч [1, с. 101].

Дынамічна ўзрастала колькасць школ, дзе навучэнцы маглі вывучаць польскую мову. Калі ў 1990 г. вывучэнне польскай мовы прапанавалася ў 174 школах (у тым ліку ў 39 школах у якасці абавязковага прадмета) Беларусі, то ў 1993 г. такіх штол было 300 (у тым ліку 81 з абавязковым вывучэннем польскай мовы). У 1990 г. вывучэннем польскай мовы ў школах былі ахоплены 8 252 вучні, а ў 1993 г. – 14 252 навучэнцаў.

Паступова ў Беларусі пачалі ствараццa польскія мастацкія калектывы. Ужо ў 1993 г. у краіне дзейнічалі каля двух дзясяткаў польскіх калектываў песні і танца, у тым ліку калектыў песні і танца “Лехіці”, які быў уганараваны званнем народнага калектыву. У 1992 г. упершыню ў Гродне быў праведзены Фестываль польскай песні ў Беларусі. У 1990-1993 гг. пры СПБ паўсталі Польскае навуковае таварыства, Польскае таварыства лекараў, Таварыства польскіх скульптараў, Клуб каталіцкай моладзі, Стартыўны клуб “Баторы”, Таварыства польскіх камбатантаў, Беларускае аддзяленне “Усходняга архіва”, Клуб моладзі і студэнтаў, Таварыства сяброў польскай культуры, Камітэты памяці Адама Міцкевіча і Элізы Ажэшка. СПБ праводзіў дзейнасць, накіраваную на ахову ў Беларусі месцаў і помнікаў, звязаных з польскай нацыянальнай памяццю; праводзіў працу ў мэтах адкрыцця памятных шыльдаў жаўнерам Арміі Краёвай (АК) і ўдзельнікам ваявых дзеянняў з польскага боку пад Гродна ў 1939 г., эксгумацыі жаўнераў АК у Радуні, шанаванне памяці ахвяр вайны. СПБ таксама планаваў сфармаваць каталог аб’ектаў “польскай гісторыі і культуры” у Беларусі, у адпаведнасці з якім павінна была адбывацца іх рэстаўрацыя і аднаўленне. Аб’яднанне планавала арганізоўваць праз такія месцы праведзенне турыстычных шляхоў, адчыняць музеі і адкрываць помнікі [2, с. 17].

У чэрвені 1992 г. напярэдадні візіту Старшыні Вярхоўнага Савета С. Шушкевіча ў Расею СПБ прапанавала аказаць разавую фінансавую дапамогу ў памеры 500 тыс. рублёў на закупку паперы для газеты “Голас над Нёманам”, што магло паскорыць атрыманне музеем беларускай культуры горада Гайнаўкі дапамогі з боку польскага ўраду. З цягам часу аб’ёмы фінансавання беларускімі органамі дзяржаўнага кіравання “Голаса на Нёманам” узрасталі. Нарастала таксама інтэнсіўнасць кантактаў беларускай меншасці ў Польшчы з польскай меншасцю ў Беларусі. Прыкладам такога супрацоўніцтва стала арганізацыя пад патранатам СПБ і Беларускага грамадска-культурнага Таварыства (БГКТ) рэгулярнага



Рэпазіторый БрДУ

правядзення па чарзе у Беластоку і Гродне навуковай канферэнцыі “Шлях да ўзаемнасці” і фестывалю “Гродна-Беласток”. Адначасова СПБ шчыльна супрацоўнічаў з польскай арнанізацыяй “Польская грамада” (“Wspólnota polska”), якое займалася фінансаваннем будаўніцтва ў Гродне школы з польскай мовай навучання і “Дома паляка”.

Актыўна вялася справа аховы гісторыка-культурных месцаў, звязаных з імёнамі Т.Касцюшкі, Ю.Нямцэвіча, Н.Орды, А.Міцкевіча, Э.Ажэшка, якія мелі значэнне як для беларускага, так і для польскага боку. Галоўную ролю ў гэтай справе адыгрывалі створаныя ў 1994 г. Фонд Напалеона Орды (кірайнік – В.А.Клімук) і Фонд Тадэвуша Касцюшкі (кіраўнік – Л.М.Несцярук).

У пачатку 1990-х гг. больш актыўна пачала ажыццяўляцца супраца паміж бібліятэкамі. Бела-Падляская бібліятэка і Брэсцкая абласная бібліятэка мелі гатоўнасць да больш шчыльнага супрацоўніцтва, аднак да 1989 г. падобная ініцыятыва не магла прынесуі поспеху, бо ўсе кантакты ажыццяўляліся цэнтралізавана. У 1989 г. пасля візіту дэлегацыі Белападляскай бібліятэкі ў Брэст справа рушыла наперад. Акрамя гэтага, да сумесных ініцыятыў далучыліся раённыя бібліятэкі Іванава і Баранавічаў. У прыватнасці, бібліятэкі мяняліся матэрыяламі аб жыцці і дзейнасці Напалеона Орды. Драгічынская бібліятэка ажыццяўляла збор матэрыялаў аб жыццёвым і творчым шляху Элаізы Ажэшка. Пінская бібліятэка пачала развівацца ў накірунку стварэння сектара польскай літаратуры і краязнаўства (З 1992 г.), у чым ёй дапамогу аказваў СПБ. У 1994 г. быў утвораны Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культыр, які спрыяў актывізацыі культурнага жыцця і ўзаемаабмена з суседзямі. Дзякуючы рабоце цэнтра ў Беларусі раз на два гады сталі праводзіцца Фестывалі нацыянальных культур. На працягу 1990-х гг. польскі бок таксама прымаў рэгулярны ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных Дню Перамогі. Штогадова лазіўся марафонскі забег Белая Падляска – Брэсцкая крэпасць, удзельнікамі якога станавіліся спартоўцы розных узростаў з Беларусі, Польшчы, Украіны і Расіі.

У траўні 1993 г. у Рэспубліканская мастацкай галерэі адкрылася выстава сусветна вядомага польскага мастака з беларускімі каранямі Л.Тарасевіча. Арганізатармі выставы выступілі Міністэрства культуры Беларусі, Міністэрства культуры і мастацтваў Польшчы, Беларускі фонд культуры і Саюз мастакоў Беларусі. У лютым 1992 г. Мінск наведалі прадстаўнікі мастацкага кіравання Міжнароднага фестывалю ў г.Торунь “Кантакт-94” К.Мейснэр і А.Блашчык. У выніку праведзеных сустрэч і працы міністэрстваў былі дасягнуты дамоўленасці аб правядзенні Нацыянальным акадэмічным тэатрам імя Купалы гастрольнага турнэ па гарадах Польшчы (Варшава, Торунь, Беласток) [3, с. 47].

Такім чынам, перыяд 1980-1990-х гг. характарызаваўся істотным ростам колькасці і маштабаў дзейнасці арганізацый, якія падтрымлівалі і ўдзельнічалі ў развіцці культурнага жыцця арганізацыя польскай меншасці ў Беларусі і спрыялі рэалізацыі разнастайных грамадскіх ініцыятыў у гуманітарнай сферы.


1. Бабосов, Е. М. Абушенко, В. Л. Богуш, Т. А. Мысливец, Н. Л. Пронько, Т. В. Гапличник, Т. И. Глина, В. Н. Котляров, И. В. "Народы, культуры и социальные процессы на пограничье" Гродненский государственный университет имени Янки Купалы Институт социологии Организация Объединенных Наций, Фонд в области народонаселения УДК 0/3(476)(06)+7/9(476)(06)
2. Беспамятных, Н. Н. Белорусскко-польско-литовское пограничье: границы, культуры, идентичности / Н.Н. Беспамятных ; [науч. ред. М. А. Можейко]. 2 - изд. – Минск : РИВШ, 2013.
3. Феномен паграніччa: польская, беларуская і ўкраінская літаратура – уплывы і ўзаемаўзбагачэнне: [Міжнар. Навук. Канф. У Любліне, 17-18 кастр. 2007 года]: зборнік артыкулаў / [прадм. С. Кавалёва, І. Набытовіча] 2008 г.


## КУЛЬТУРНО-ГУМАНИТАРНОЕ СОТРУДНИЧЕСТВО КНР С РЕСПУБЛИКОЙ БЕЛАРУСЬ В 1992–2017 ГГ.

Сунь Инцзе (Минск, Беларусь)

20 января 1992 г. КНР и Республика Беларусь официально установили дипломатические отношения. С этого момента стороны непрерывно уделяют внимание развитию культурно-гуманитарных связей. Уже 25 ноября 1992 г. было подписано Межправительственное соглашение, предусматривавшееобмен и сотрудничество между соответствующими учреждениями двух стран в области культуры и искусства, образования, общественных наук, масс-медиа [1].

В 1992-2005 гг.прослеживаласьдинамика стабильного развития двусторонних отношений, в 2005 г. они были официально переведены на уровень всестороного развития и стратегического сотрудничества. В2013 г. они были подняты до уровня всестороннего стратегического партнерства. В Совместной декларации было объявлено о важности непрерывного укреплениясотрудничества в научно-технической, культурной, образовательной и других областях [2]. В 2014 г. в г. Пекине было подписано Межправительственное соглашение о создании Белорусско-Китайского комитета по сотрудничеству [3]. В настоящий момент отношения характеризуютсякак доверительное всестороннее стратегическое партнерство и взаимовыгодное сотрудничество. В мае 2017 г. в КНР на высшем уровне было отмечено, что Китай ви-